# СВАБОДА

НЕЗАЛЕЖНАЯ ГАЗЕТА

№ 29 (44), 16 – 22.11. 2006 г.

# ЯНКА КУПАЛА Ў МАСКВЕ

## АДКРЫЦЦЁ ПОМНІКА ПАЭТУ АДКЛАДВАЕЦЦА

10 лістапада ў Маскве, падчас візіту Аляксандра Лукашэнкі, павінна была адбыцца афіцыйная цырымонія адкрыцця помніка вялікаму беларускаму паэту. Аб гэтым не аднойчы паведамлялі інфармацыйныя агенцтвы Беларусі і Расіі. Ва ўрачыстасці меліся ўзяць удзел прэзідэнт Лукашэнка, мэр Масквы Лужкоў, іншыя высокія асобы. Аўтараў помніка Купалу – беларускіх скульптараў бацьку і сына Льва і Сяргея Гумілеўскіх – запрасіць на цырымонію чамусьці забыліся. (Леў Гумілеўскі вядомы, у прыватнасці, як аўтар помніка Багдановічу ў Мінску).

Аднак ужо ў самы пярэдадзень перамоваў Лукашэнкі з Пуціным, 9 лістапада, стала вядома, што ўрачыстая цырымонія адкладваецца. Відаць, нехта (Лукашэнка ці Пуцін – невядома) палічыў яе неадпаведнай палітычнаму моманту.

Між тым, адкрыццё помніка пераносіцца далёка не ўпершыню. Ідэя яго ўсталявання нарадзілася некалькі гадоў таму падчас Купалаўскіх чытанняў у Маскве. Было прапанавана паставіць помнік да 120-годдзя Купалы, і мэр Масквы Лужкоў абяцаў быў гэта зрабіць. Ініцыятыву тады падхапілі прадстаўнікі беларускай дыяспары, сябры грамады беларускай культуры, а таксама Згуртаванне беларусаў свету "Бацькаўшчына". Аднак, ідэя сутыкнулася з супрацівам ураду Масквы. Мэрыя некалькі разоў адхіляла праект. Асабліва не спадабалася ўладам пачатковая прапанова ўсталяваць помнік на месцы смерці паэта.

Купала трагічна загінуў 28 чэрвеня 1942 году ў Маскве пры загадкавых абставінах. Ніхто ў перапоўненым гатэлі "Масква", дзе паэт разам з іншымі літаратарамі жыў у эвакуацыі, не быў сведкам яго гібелі, таму вырашылі, што Купала сам упаў у пралёт лесвіцы. У 1962 годзе Янка Купала быў перазахаваны на Вайсковых могілках у Мінску, побач з Якубам Коласам.

У нашыя дні мэрыя Масквы пастанавіла зруйнаваць будынак гатэля, паколькі ён... не мае гістарычнай каштоўнасці. Беларускаму міністэрству культуры, нягледзячы на просьбы, не ўдалося атрымаць нават дзверы нумара, у якім жыў Купала. (Узамен выдалі дзверы ад нейкага іншага пакоя.)

Пазней ідэю ўсталявання помніка ў Маскве прысабечыла ўлада. На сайце прэзідэнта РБ гаворыцца, што з ініцыятывай падараваць помнік гораду Маскве выступіў кіраўнік дзяржавы. Там



**Помнік Янку Купалу** *скульптараў Льва і Сяргея Гумілеўскіх. Масква, лістапад 2006 году*

можна прачытаць, што "установка памятника великому песняру станет еще одним ярким символом братской дружбы народов Беларуси и России». Відаць, ідэя нарадзілася пасля таго, як Лужкоў падараваў Мінску помнік Пушкіну.

Грошы – прыкладна 3 мільёны 720 тысяч рублёў – былі выдаткаваныя з так званага саюзнага бюджэту Беларусі і Расіі на парытэтных пачатках.

**Працяг на стар. 3**

# ЦІ МОЖНА ПАРАЗУМЕЦЦА З УЛАДАЙ?

► СТАР. 2, 4

# КРЭМЛЬ НЕ ДЫСКУТУЕ З ЛУКАШЭНКАМ

► СТАР.5

# ЦІ МАГЧЫМАЕ ПАРАЗУМЕННЕ ЎЛАДЫ І ЯЕ АПАНЕНТАЎ НА ГЛЕБЕ ДЗЯРЖАЎНІЦКАЙ ПАЗІЦЫІ?

**АЛЯКСАНДР МІЛІНКЕВІЧ, ЛІДЭР АБ'ЯДНАНАЙ АПАЗІЦЫІ:**

## "Я ГЭТАЙ УЛАДЗЕ НЕ ВЕРУ"

Я лічу, калі мова ідзе пра захаванне суверэнітэту, то могуць быць аднолькавыя погляды і сінхронныя дзеянні. Але я гэтай уладзе не веру. Бо ў яе няма такіх каштоўнасцяў, як незалежнасць. Няма патрыятызму сапраўднага. Ёсць толькі вялікая патрэба ў неабмежаванай уладзе. Таму я не бачу магчымасцяў для нейкага паразумення.

**НАТАЛЛЯ, ХАТНЯЯ ГАСПАДЫНЯ:**

## "ДАПУСКАЮ, ШТО НЕКАМУ З БНФ ДАДУЦЬ ВЫСТУПІЦЬ НА БТ"

Калі іхныя інтарэсы хоць у нечым перакрыжуюцца, то адразу знойдзецца і паразуменне. Наўрад ці гэта будзе беларусізацыя ці нешта падобнае. Але рэакцыя на спробы ўвесці адзіную расійскую валюту будзе аднолькавай – як з боку Лукашэнкі, так і з боку апазіцыі. Дапускаю, што тады некаму з БНФ дадуць выступіць на БТ.

**АЛЕГ ТРУСАЎ, СТАРШЫНЯ ТАВАРЫСТВА БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ:**

## "КАЛІ СМАЖАНЫ ПЕВЕНЬ КЛЮНЕ"

Канечне, паразуменне магчымае. Вялікіх крыўдаў не было. Да грамадзянскай вайны, дзякуй Богу, мы не дажылі. А гісторыя ведае паразуменні пасля грамадзянскай вайны, як, напрыклад, у Іспаніі ці Фінляндыі. А ў нас што? Ну, знікла пара чалавек... Я проста як гісторык гляджу. Я ведаю, што ва ўлады планы паразумення напісаныя даўно. Нават ёсць праект паразумення з "канструктыўнай апазіцыяй". Не з усёй. Калі будзе зусім кепска, дык апазіцыя падзеліцца на "нашых" і "нянашых". І Нісцюк, напрыклад, будзе "наш". А Трусаў — "нянаш". І пачнецца канструктыўная работа. Калі смажаны певень у адно месца клюне, магчыма ўсё. Тым больш, што "круглы стол" наконт чатырох прынцыпаў АБСЕ аднойчы праводзілі. Але пасля згарнулі гэты стол. Калі газ і нафта стануць дарагімі, я не сумняюся, што ізноў будуць абмяркоўвацца чатыры прынцыпы АБСЕ. Пачакаем дзеянняў брацкай Расіі.

**УЛАДЗІМІР НІСЦЮК, БЕЛАРУСКАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТЫЧНАЯ ПАРТЫЯ "ГРАМАДА":**

## "ТРЭБА ПЕРАСТУПІЦЬ ПРАЗ СЯБЕ"

Зараз і ўлада, і ўсе дэмакратычныя сілы зацікаўленыя ў тым, каб Беларусь заставалася Беларуссю. Розныя матывы, розныя падыходы, але мэта адна. І мне бачыцца, што калі створыцца такая сітуацыя, калі трэба будзе актывізаваць барацьбу за наш суверэнітэт, то на гэтай глебе можна знайсці паразуменне паміж уладай і тымі, хто на сёння з'яўляецца вельмі жорсткім яе апанентам. Таму што калі гарыць хата, трэба пажар тушыць, а не працягваць спрачацца паміж сабой. Шмат чаго ўлада зрабіла дрэннага для апазіцыі, але шмат чаго і апазіцыя дрэннага зрабіла для ўлады. Шмат гадоў Лукашэнка знаходзіцца пад моцным агнём не проста крытыкі, а калінікалі здзекаў з боку апазіцыянераў. Таму трэба зараз пераступіць праз сябе. І тады знойдзецца паразуменне.

**ВАЛЕРЫ, МЕДЫК:**

## "ПРА ШТО МОЖА БЫЦЬ ГАВОРКА?"

Пра што можна гаварыць пасля забойства Ганчара і Захаранкі? Пра якія дараванні і прыязнасць можа быць гаворка? Калі нехта з апазіцыйных дзеячоў перакрочыць праз трупы, дык што тады можна будзе сказаць пра іх?

**ВІНЦУК ВЯЧОРКА, СТАРШЫНЯ БНФ:**

## "ПРЫЯРЫТЭТАМ УЛАДЫ ЁСЦЬ УРАТАВАННЕ СЯБЕ САМОЙ"

Такое паразуменне немагчымае. Бо шанцы для яго былі ў сувязі з абвастрэннем пагрозы для беларускай дзяржаўнасці, нашай эканамічнай незалежнасці. Але ўлада рэагуе на гэтую небяспеку з рэакцыяй, абсалютна адваротнай здароваму сэнсу. Яна толькі абвастрае рэпрэсіі супраць незалежніцкіх сілаў. Гэта азначае, што прыярытэтам для ўлады ёсць не ўмацаванне і ўратаванне беларускай дзяржаўнасці, а ўратаванне сябе самой. Што б там ні казалі некаторыя адвакаты цяперашняй улады, на жаль, гэта так ёсць.

**ВАСІЛЬ, ПРАДПРЫМАЛЬНІК:**

## "НІЯКІХ ДАМОВАЎ БЫЦЬ НЕ МОЖА"

Якія б словы ні даносіліся з боку ўлады, якія б прыемныя міны там ні маляваліся часам, але калі чалавек трапіў у гэтую ўладу, то на ім стаіць пажыццёвае таўро. Бо інакш туды трапіць немагчыма. Там вядзецца сур'ёзная селекцыя па адборы кадраў. І самае адборнае г… ужо адабранае. Таму ніякіх дамоў з імі, лічу, быць не можа.

**ВАЛЯНЦІН АКУДОВІЧ, ФІЛОСАФ:**

## "ПАРАЗУМЕННЯ "НАОГУЛ" НЕ БЫВАЕ"

З гледзішча ўлады гэта немагчыма, бо ў гэтым няма ніякага сэнсу. Улада магла б шукаць паразумення з апазіцыяй, калі б апазіцыя была моцнай, калі б апазіцыя была рэальнай палітычнай сілай, якая пагражае стабільнасці гэтай улады. Калі адзін з бакоў не мае патрэбы ў паразуменні з другім, то пра якое паразуменне можна казаць? Апазіцыя не ёсць чымсці маналітным. У ёй ёсць сілы, якія гатовы паразумецца з уладай, найперш тыя, што былі выціснутыя з уладных структураў. І калі б гэтае паразуменне дало магчымасьць вярнуцца ізноў да ўлады, то, хутчэй за ўсё, яны былі б гатовыя гэта зрабіць. Апазіцыю таксама складаюць людзі, якія не прымаюць гэтую ўладу па вызначэнні, для якіх нават спроба паразумення – гэта здрада ідэалам. Яны хутчэй пагодзяцца з канцом свету. Хтосці быў бы гатовы, толькі калі б улада прадэманстравала нейкія крокі насустрач. Але ўсё пералічанае – абсалютная абстракцыя. Паразумення "наогул" не бывае. Паразуменне павінна быць у чымсці канкрэтным. А пакуль нават няма падставаў казаць, што такое паразуменне хоць каму патрэбнае.

**Каментар на стар. 4.**

# АНЖАЛІКА БОРЫС АДМОВІЛАСЯ ІСЦІ НА САСТУПКІ КГБ

Старшыня Саюза палякаў Беларусі Анжаліка Борыс была пакліканая на допыт у гродзенскае абласное ўпраўленне КГБ у якасці сведкі па крымінальнай справе аб кантрабандзе наркотыкаў. Як паведамляе "Радыё Свабода", допыт працягваўся больш за чатыры гадзіны.

Спачатку да Анжалікі Борыс не хацелі дапускаць адваката Ўладзіміра Кісялевіча, і яна адмовілася адказваць на пытанні. Тады адвакату дазволілі прысутнічаць на допыце. Пасля гэтага старшы следчы па асабліва важных справах маёр Віктар Ражко заявіў, што яны хочуць здымаць допыт на відэастужку.



Анжаліка Борыс не пагадзілася, сказаўшы, што раней такія відазапісы не аднойчы выкарыстоўвала потым беларускае тэлебачанне ў сваіх перадачах.

Калі відэакамеру ўсё ж уключылі, Анжаліка Борыс адмовілася гаварыць. Такім чынам яна дамаглася, каб яе перасталі здымаць. Старшыня СПБ таксама адмовілася падпісваць паперу аб тым, што яна не будзе распавядаць пра змест допытаў.

Перад гэтым у КГБ дапыталі Анджэя Лісоўскага. Як паведамлялася, 29 кастрычніка ў ягоным аўтамабілі Аўдзі, сярод пасажыраў якога была і Борыс, мытнікі на мяжы знайшлі белае рэчыва ў вонкавым люстэрку. Пазней улады заявілі, што гэта быў гераін. З Лісоўскага, які быў названы галоўным падазраваным у справе, узялі падпіску аб нявыездзе. Але ён таксама адмовіўся падпісваць дакумент аб неразгалошванні зместу допытаў.

# СЯРГЕЙ СКРАБЕЦ СХУДНЕЎ У ТУРМЕ НА 30 КГ

Былы дэпутат парламента палітвязень Сяргей Скрабец за паўтары гады зняволення схуднеў на 30 кілаграмаў. У віцебскай калоніі палітвязень падтрымліваў галадоўку экскандыдата ў прэзідэнты Аляксандра Казуліна і галадаў разам з ім 27 дзён – аж да вызвалення .

**Паводле Хартыі'97**

**На здымках**: *Сяргей Скрабец да і пасля турмы.*





# ЯНКА КУПАЛА Ў МАСКВЕ

## АДКРЫЦЦЁ ПОМНІКА ПАЭТУ АДКЛАДВАЕЦЦА

**Працяг са старонкі 1**

Помнік Купалу ў Маскве планавалася ўрачыста адчыніць у верасні 2004 году, на дзень горада. Потым дату перанеслі на верасень 2005-га, потым на красавік 2006-га (у гонар 10-годдзя ўтварэння Садружнасці Беларусі і Расіі). Нарэшце сёлета ў верасні чатырохметровы бронзавы манумент заняў сваё месца на Кутузаўскім праспекце. Але адкрыцця зноў не адбылося. У прэсе называлася новая дата – 28 лістапада. Але ў гэты дзень, як вядома, Лукашэнка будзе на саміце СНД у Мінску. Зноў нейкая няўвязка?

Варта нагадаць, што ў Мінску, акрамя помніка Пушкіну, ёсць яшчэ помнік Горкаму ў аднайменным парку. У Маскве, як і ў астатняй Расіі, дагэтуль не было ніводнага помніка ніводнаму з беларускіх пісьменнікаў або дзеячоў культуры.

У 1970-м годзе, дзякуючы намаганням беларускай дыяспары ў ЗША, бюст Купалы быў пастаўлены ў Араў-парку, у гарадку Манро блізу Нью-Ёрка. Ён стаіць побач з бюстамі Тараса Шаўчэнкі, Аляксандра Пушкіна і класікаў амерыканскай літаратуры.

Зразумела, імя Купалы, аўтара несмяротнага верша "А хто там ідзе?" назаўсёды застанецца ў гісторыі беларускай і сусветнай культуры, незалежна ад колькасці пастаўленых яму помнікаў. А гісторыя з бясконцымі пераносамі адкрыцця манумента ў Маскве застанецца на сумленні палітыкаў, якія жывуць адным днём.

**А. Уласаў**

# АПАГАНЕНЫ МЕМАРЫЯЛ "ЯМА"

**У мінулыя выходныя мемарыяльны комплекс «Яма», створаны ў памяць расстраляных фашыстамі мінскіх габрэяў, быў апаганены невядомымі. Яны нанеслі выяву свастыкі ды аблілі белай фарбай скульптурную кампазіцыю "Апошні шлях", якая сімвалізуе Халакост.**

**Каля мемарыялу знайшлі ўлёткі за подпісам ад імя "Фронту арыйскага супраціву "Белая Русь". Адначасова на ўваходзе ў Ізраільскі інфармацыйна-культурны цэнтр у Мінску таксама з'явіліся свастыкі і антысеміцкія надпісы.**

**Усяго за пару дзён да гэтага, 9 лістапада, на "Яме" адзначалі Міжнародны дзень барацьбы з фашызмам і антысемітызмам.**

**У КГБ цвердзяць, што не маюць інфармацыі аб арганізацыі "Фронт арыйскага супраціву "Белая Русь", і што гэта была хуліганская выхадка падлеткаў.**

**Следства вядзе мінская міліцыя.**

*Паводле СМІ*



**Свастыка на помніку ў** *мемарыяльным комплексе «Яма», Мінск,13 лістапада 2006 году.*

# РАШЭННІ, ЯКІХ МЫ СТАРАЕМСЯ НЕ ЗАЎВАЖАЦЬ

## ЯК ЗАГАВАРЫЦЬ З НАРОДАМ НА ЯГОНАЙ МОВЕ ДУШЫ?

Сёння, калі адзначаюцца сотыя ўгодкі першай беларускай газеты "Наша Ніва", не можа не здзіўляць розніца паміж светапоглядам пазіцыяй нашых дэмакратаў пачатку мінулага стагоддзя і сённяшніх. Уявіце сабе ў сённяшняй апазіцыйнай газеце наступныя праграмныя радкі: "Трэба не толькі гаварыць аб еднасці ўсіх беларусаў, але жыццём сваім шырыць згоду і братнюю любоў у народзе". Вы скажаце, што пісаць такое сёння проста немагчыма. З іншага боку, хто б з сучасных дэмакратаў не паставіў пад гэтымі радкамі свой подпіс?

Адкуль такі парадокс? Беларусь – незалежная краіна, пра якую нашаніўцы не маглі і марыць, а нязгоды і непаразумення ў шэрагах найбольш прагрэсіўнай публікі толькі паболела.

А.Мілінкевіч кажа: я не веру гэтай уладзе. Рацыя, калі ўся ўлада ў руках аднаго чалавека, які парушыў усе магчымыя законы і нормы, які папросту не гаворыць праўды, а толькі бясконца "пудрыць мазгі", — такому няма веры. Але разам з тым улада – гэта дзясяткі тысяч людзей, і ад нас таксама залежыць, якой мы яе бачым – ці ўладай аднаго чалавека, ці гэтымі самымі дзясяткамі тысяч. Участковы міліцыянер або кабета ў раённай землямернай канторы – гэта таксама ўлада. Ці ёсць у нас падставы ўсім ім – не верыць?

Лукашэнка – гэта не столькі віна, колькі бяда і для народа, і для апазіцыі, і для ўлады таксама. Церпіць, як заўсёды, народ. А апазіцыя люстэркава паўтарае ўсе целазрухі ўлады, якая таксама церпіць. Бо маса кіраўнікоў на месцах – з "філасофскай кампанентай" у мазгах – разумее ўсю недарэчнасць кантэксту, у якім даводзіцца кіраваць.



**Аляксандр Мілінкевіч** *збірае подпісы за кандыдатаў у дэпутаты мясцовых саветаў. Ён увайшоў у склад некалькіх дзясяткаў ініцыятыўных групаў.*

Тысячы беларусаў ажыццяўляюць функцыі ўлады і кормяць свае сем'і. Змяніце рэжым – яны застануцца на месцах, бо, па-першае, ведаюць, што і як, па-другое, іншых няма. І ёсць электарат, які не ведае простых рэчаў – напрыклад, старыя, якім плоцяць пенсію "воўрамя", не разумеюць, што сваімі мольбамі аб "стабільнасці" яны адбіраюць жыццё ў сваіх дзяцей, альбо маладыя, якія дзякуюць прэзідэнту за тое, што клопат пра іхных бацькоў ён узваліў на свае плечы, тым самым адабраўшы гэты клопат у іх, дзяцей. Людзі пагодзяцца, што гэтак жыць, а найперш, гэтак думаць – ненармальна. Толькі хто ім пра гэта скажа?

Атаесамленне ўлады і Лукашэнкі – гэта бяда апазіцыі, бо ў такім поглядзе на справы проста не відаць будучыні. Адчаяўшыся дачакацца якіх-кольвек перамен, нехта пайшоў у глухую абарону, нехта спадзяецца толькі на цуд, нехта вядзе "агонь на паражэнне", а спадар Нісцюк заклікае дэмакратаў "пераступіць праз сябе". Але сумленны чалавек можа "пераступіць праз сябе" хіба толькі ў творчасці, дзе пануе прынцып: "зрабі ўсё, што можаш, і трошкі больш". Пераступіць праз сябе дзеля Лукашэнкі – гэта значыць, пераступіць праз сумленне і пачаць шкадаваць дыктатара, што апынуўся "пад вельмі моцным агнём". Каб шукаць паразумення з уладай, пераступаць праз сябе не трэба. Вось толькі як перастаць атаясамліваць уладу з вобразам Лукашэнкі – вялікае пытанне. Але вырашаць яго прыйдзецца рана ці позна, бо ўлада патрэбная пры любым рэжыме. І з уладай рана ці позна трэба пачынаць працаваць.

Прынцып тут адзін, і яго ведаюць усе: дзеля паразумення нехта павінен зрабіць крок першым. А менавіта – адкрыцца. Сёння сваёй закрытасцю апазіцыя люстэркава паўтарае закрытасць рэжыму. І на мінулых выбарах прэзідэнта гэтая закрытасць стала галоўнай перашкодай у працы альтэрнатыўнага кандыдата – закрытая каманда, закрытыя планы дзейнасці, закрытыя рашэнні... Герметычная кампанія, якая адгарадзілася ад тысяч і тысяч "баяздольных" грамадзян і суполак, што прагнулі ўдзельнічаць у працэсе, але не маглі. Каманда Мілінкевіча сваім герметызмам паўтарала герметызм каманды Лукашэнкі, проста не здолела перамагчы гэтае навязанае ёй кімсьці гульні.

Але вось спадар Мілінкевіч прыязджае ў сваю вёску Бершты, дзе ён займаецца краязнаўствам, арганізацыяй вясковага турызму, этнаграфічнымі зборамі – і ўсё змяняецца. Мілікевіч абсалютна нармальна і дзесяткі разоў кантактуе з уладай – і ў справе зямлі, уласнасці, аховы, транспарту – лес падвезці, – мноства самых розных рэчаў. Дапускаю, што кантактуе ў поўным паразуменні. Лукашэнкам тут ані тхне. Не важна, што гаворка ідзе пра "маленькія ўлады" – з малога ўсё пачынаецца. Што ж адбылося? Мілінкевіч адкрыўся са сваімі клопатамі і ўзнікла паразуменне. Не важна таксама, што гэта не палітычнае паразуменне. Палітыка знаходзіцца на самай вяршыні і цалкам залежыць ад асновы – ад нашых адносінаў і паразумення ў рэальным "бытавым" жыцці.

Як стварыць адкрытую апазіцыю, якая перастане быць люстэркава падобнай да ўлады? Якая агонь на паражэнне ўлады і заклікі да народа – галадаваць – зменіць на канструктыўную і любасную гутарку з гэтым самым народам, прапануе яму схемы выжывання, зараблення, дабрабыту? Як дастукацца да чынавенства, якому, па вялікім рахунку, усё адно, каму служыць у сваіх сабесах. Як загаварыць з народам на ягонай мове душы? (Пэўне ж, гэта будзе не руская мова). Можа быць, адказ на гэтыя пытанні – з "Нашай Нівы" – мы ведаем ужо сто гадоў?

**Алесь Кебік**

# АДКЛАДЗЕНАЯ ПАРТЫЯ

## КРЭМЛЬ НЕ ДЫСКУТУЕ З ЛУКАШЭНКАМ, АЛЕ ПРАЦЯГВАЕ БІЦЬ ПА “БОЛЕВЫХ КРОПКАХ”

***Тое, што адразу пасля вяртання з Масквы Аляксандр Лукашэнка склікаў нараду па праблемах забеспячэння краіны энерганосьбітамі, лепш за любыя заявы сведчыць пра выніку візіту.***

І хаця кіраўнік Беларусі спрабаваў супакоіць грамадства шматслоўнай прамовай пра тое, як ён знайшоў паразуменне з Уладзімірам Пуціным, выглядае, што трэба рыхтавацца да непрыемных сюрпрызаў.

Крэмль паступова цісне на болевыя кропкі Лукашэнкі з ягоным “эканамічным цудам”. Найперш Расія збіраецца істотна падвысіць кошты на нафту і газ. Зусім нядаўна Лукашэнка гучна пагражаў “разрывам адносінаў”, калі гэта адбудзецца. Цяпер ён енчыць пра “роўныя ўмовы для прадпрыемстваў” дзвюх краін.

Але ж відавочна, што пры гэтым кіраўнік Беларусі пацiху пачаў дыстанцыявацца ад непрыемнага пытання. Маўляў, кошт на газ будзе такі, пра які дамовяцца “суб’екты гаспадарання”. Пры тым адначасова ўжываюцца два супярэчлівыя тэзісы: цана мусіць быць такой, як у Расіі; цана не можа быць большай, чым для Украіны і Арменіі. Падобна, што першы варыянт ужо не разглядае ўсур’ёз і сам Лукашэнка. Таму, здаўшы першую лінію абароны, ён перайшоў на другую: цяпер гутарка вядзецца пра “армянскі варыянт” – 110 даляраў за тысячу кубаметраў газа. Гэта ўжо ў два з паловай разы больш, чым сёння. Аднак нагадаю, што “Газпром” патрабуе ажно 200 даляраў.

Ізноў жа, зусім нядаўна Лукашэнка сцвярджаў, што Беларусь купляе расійскую нафту па коштах, вышэйшых за сусветныя. Гэтым разам ён засведчыў адваротнае. Паводле Лукашэнкі, Беларусь добра зарабляе на расійскім “чорным паліве” і збіраецца гэта рабіць далей. Таму кіраўнік Беларусі патрабуе, каб у Мазыр і Наваполацк нафта пастаўлялася па тых самых коштах, што і на расійскія заводы.

Аднак нават калі фармальна цана будзе роўная, пытанні застануцца. Бо Расія пагражае, што калі Беларусь не будзе аддаваць ёй ільвіную долю экспартнага мыта на нафтапрадукты, аб’ём паставак сыравіны ў нашу краіну будзе абмежаваны ейнымі ўнутранымі патрэбамі. У гэтым выпадку пра нафтавыя дывідэнды, якія сёння дазваляюць мінскаму кіраўніцтву пачувацца нядрэнна, можна забыцца – на продажы бензіну айчынным аўтааматарам шмат не заробіш.

Але гэта яшчэ не ўсе непрыемнасці. Значная частка прадукцыі нашых прадпрыемстваў рэалізуецца менавіта ў Расіі. А тамтэйшы рынак паступова ўводзіць абмежаванні на беларускія тавары. Расійскія вытворцы цукру ўжо даўно дамагаюцца мыта на прадукцыю канкурэнтаў з “братэрскай” дзяржавы. А міністэрства па эканамічным развіцці і гандлі Расійскай Федэрацыі наогул рэкамендавала рэгіёнам спыніць закупкі беларускіх тавараў за сродкі дзяржбюджэту.

Адпаведныя тэмы ўздымаліся і на сустрэчы Лукашэнкі з Пуціным. І хаця кіраўнік РБ аптымістычна заявіў, што, прыкладам, пытанне цукру мусіць быць вырашанае да канца тыдня, відавочна, што гэтага не адбудзецца, і праблемы збыту айчынным вытворцам давядзецца вырашаць у складаных умовах.

Такім чынам, Расія цісне на Беларусь адразу па шэрагу кірункаў. Спробы пазбавіць Лукашэнку некаторых выгодаў здараліся і раней, але Крамлю не хапала паслядоўнасці. Таму фінал кожны раз быў аднолькавы: Лукашэнка усчыняў гвалт пра ворагаў, якія руйнуюць саюз славянскіх дзяржаў, і Масква ўрэшце вырашала, што танней адкупіца ад свайго няўрымслівага хаўрусніка, чым змагацца з ім.

Але гэтым разам антыбеларуская кампанія доўжыцца ўжо амаль паўгода. Лукашэнку паступова пазбаўляюць прывілеяў, дзякуючы якім ён адносна спакойна існаваў большую частку свайго кіравання. Звыклыя спробы кіраўніка Беларусі дамагчыся свайго з дапамогай скандалу, поспеху не мелі. Масква не ўступае ў адкрытую дыскусію з Мінскам, але спакваля працягвае біць па “болевых кропках” беларускай эканомікі.

І высвятляецца, што пэўнага адказу на такую тактыку Лукашэнка вынайсці не ў стане. Таму ён спрабуе цягнуць час, спадзеючыся, што неўзабаве расійскае кіраўніцтва вымушанае будзе сканцэнтравацца на іншых праблемах кшталту абрання пераемніка Пуціна. Да таго ж, Расія пакуль больш палохае, чым дзейнічае. І канфлікт з Лукашэнкам ёй надта нявыгадны, бо Крэмль сёння не бачыць больш прымальнай для сябе персоны на пасадзе кіраўніка Беларусі.

Таму гандаль будзе працягвацца. У Маскве ніводны з бакоў не здолеў навязаць іншаму сваю волю. Партыя чарговы раз адкладзеная. Наступны раўнд прымеркаваны да 28 лістапада, калі Лукашэнка і Пуцін мусяць сустрэцца ўжо ў Мінску, на саміце СНД.

**Віктар Філін**

**... гэтым разам антыбеларуская кампанія доўжыцца ўжо амаль паўгода. Лукашэнку паступова пазбаўляюць прывілеяў, дзякуючы якім ён адносна спакойна існаваў большую частку свайго кіравання.**




belzhaba.com

Саюздрук

# СТАБІЛЬНАСЦЬ У ЦАНЕ

## "ВОСЬ БЫ МНЕ 18 ТЫСЯЧ ГАТОЎКАЙ"

Публіцыст "Народнай газеты" Віктар Лешчанка адзначыў гадавіну расійскай Кастрычніцкай рэвалюцыі пабаявому. У вялікім артыкуле аўтар прымроіў нейкія паралелі паміж кастрычнікам 1917-га ў Пецярбургу і кастрычнікам 2006-га ў Бішкеку.

*"Гром грянул как раз в прошедшие Октябрьские праздники. Президент Курманбек Бакиев предложил новый вариант Конституции, где не было ни слова об обещанной парламентской республике. Около 20 депутатов в ночь на 7 ноября созвали учредительное собрание и проголосовали за свой вариант основного закона. Утром страна проснулась, не зная, что наступило двоевластие…*

*Таджикистан через нечто похожее прошел. Гражданская война 90-х годов уже позади. В минувшие выходные здесь выбирали президента. На высокий пост претендовало пять кандидатов. Явка на выборы — свыше 90 процентов. За ныне действующего лидера проголосовало около 80 процентов избирателей. Президент Беларуси Александр Лукашенко поздравил Эмомали Рахмонова с переизбранием.*

*Стабильность сегодня в особой цене".*

Што б дзе ні здарылася – ў Кыргызстане, у Грузіі, ці на Месяцы, высновы ў дзяржаўных аналітыкаў будуць аднолькавыя. Пра каштоўнасць стабільнасці і пра тое, як нам усім пашанцавала з правадыром. Вось толькі барані Бог каму ўсур'ёз паверыць у гэтую стабільнасць. Як паверылі некалі многія ўкладчыкі Сбербанка СССР, вельмі стабільнай установы звышстабільнай дзяржавы.

Тым часам "Советская Белоруссия" рапартуе пра нечуваныя поспехі ў будаўніцтве аграгарадкоў.

*"За последние 10 лет сельское строительство, объемы которого в начале 90–х, образно выражаясь, сошли на нет, проделало тернистый путь от первых жилых домиков, возведенных по президентской программе, до обустройства агрогородков, начатого в прошлом году. Еще лет пять-шесть назад, когда государству приходилось экономить каждую копейку, жилье для крестьян строилось по принципу минимализма: примитивные проекты, маленькие комнатки, тесные сараи. Тем не менее и такие квартиры были желанными для сельских жителей, не имевших собственного угла. С подъемом экономики в стране Президент потребовал улучшить потребительские свойства деревенских усадеб. И они стали преображаться. Вместо прежних 17 — 18 тысяч долларов коттеджи стали стоить 40 — 50 тысяч у.е., но специалисты уверены, что именно качественная жилплощадь может возродить село и привлечь туда специалистов".*

Шмат я ездзіў па роднай старонцы. І хоць бы раз пачуць добрае слова з вуснаў удзячных сялянаў, якіх ашчаслівілі недаробленымі дамамі з кепскімі печкамі і катушкамі-сараямі, заміж таго, каб вылучыць крэдыт пад набыццё нармальнага дома. Якіх у вёсцы хапае звыш меры. Самая сакраментальная фраза з вуснаў «шчасліўчыкаў» гучыць так: «Вось бы мне тыя 18 тысяч гатоўкай. Я палац бы пабудаваў». Цяпер ім прыйдзецца прыкладаць больш фантазіі.

Але, нягледзячы на ўсе вясёлкавыя рапарты, існуе мова лічбаў. Больш простая і канкрэтная.

Дысанансам з агульным святочным настроем дзяржаўных газет гучыць публікацыя ў «Звяздзе». Начальнік аддзела дэмаграфічных даследаванняў НДІ статыстыкі Міністэрства статыстыкі Рэспублікі Беларусь Вольга Філіпава прыводзіць наступныя лічбы.

*"— У першую чаргу трэба звярнуць увагу на працягласць жыцця і смяротнасць беларусаў. Устойлівай тэндэнцыі павышэння сярэдняй чаканай працягласці жыцця ў Беларусі не назіраецца, зараз яна складае 75,1 года ў жанчын і 62,9 года — у мужчын (дадзеныя за 2005 год). Розніца ў 12 гадоў — проста ашаламляльная! Ні ў адной эканамічна развітай краіне свету не існуе такога вялікага разрыву ў сярэдняй чаканай працягласці жыцця мужчынскага і жаночага насельніцтва. Паказчык смяротнасці мужчын у працаздольным узросце ў 4 разы перавышае паказчык смяротнасці жанчын у аналагічным узросце! А вяскоўцы жывуць менш, чым гараджане. Калі ў гараджан сярэдняя працягласць жыцця складае 70,5, то ў вяскоўцаў — 64,5 года. Ні ў адной эканамічна развітай краіне свету не існуе такога вялікага разрыву ў сярэдняй чаканай працягласці жыцця гарадскога і сельскага насельніцтва..."*

Можна ўзяць калькулятар і падлічыць, што будзе з беларускай вёскай праз адно пакаленне. Нічога страшнага не адбудзецца. У жывых і здаровых застануцца тыя, што гатовыя працаваць на сябе і браць адказнасць за вялікую гаспадарку. А вось што будзе з тымі аграгарадкамі – гэта пытанне.

**Алесь Канюціч**

Як робяцца хвалі

# ПРА ГАЛАДОЎКІ І КІСЕЛЬ, ЯКІ НЕ ВЫП'ЕШ

Штодня на ўсіх радыёстанцыях ідуць справаздачы пра галадоўкі. І калі яшчэ галадоўка вернікаў царвы "Новае жыццё" неяк зразумелая (сапраўды, ціхамірны хрысціянскі пакорлівы пратэст), дык галадоўкі палітыкаў і прафсаюзных дзеячоў выклікаюць і здзіўленне і абурэнне. Няўжо не можна прыдумаць іншых спосабаў дзеяння? Вось, напрыклад, славутая "Наша Ніва", 100 гадоў якой мы цяпер адзначаем, у кожным нумары друкавала ўзоры пазітыўнай стваральнай дзейнасці: там і там сяляне арганізаваліся і купілі новы магутны плуг; там і там арганізаваліся і выбралі свайго дэпутата... А ў нас ні палітычныя партыі, ні СМІ амаль не прапануюць стваральных спосабаў дзейнасці для актыўнага чалавека. Даведзеным да адчаю людзям застаецца адно – галадаць.

14 лістапада на "Еўрапейскім Радыё для Беларусі" ў праграме "Еўрагрош" ананн савалі расказ пра "беларускі напой". Я ўжо не буду пытацца, чаму ў эканамічнай праграме распавядаюць рэцэпты традыцыйнай народнай кухні, хачу пагаварыць пра сам "напой". Гэтым напоем аказаўся беларускі аўсяны кісель. Відавочна, вядучая ні разу гэтага кісяля ані бачыла, ані каштавала. Бо беларускі аўсяны кісель – страва густая і яе не п'юць, а ядуць лыжкамі. (Не трэба блытаць з тым савецкім кісялём у школьнай сталоўцы.)

8 лістапада на тым самым "Еўрапейскім Радыё" былі дзве згадкі пра дзяцей. Адзін карэспандэнт сказаў такую фразу: "Кабета вырашае, ці варта жыць ейнаму дзіцяці-калецы". Слова "калека", хоць і мае канчатак жаночага роду, але ў гэтай сітуацыі павінна змяняцца як слова ніякага роду. Таму правільна будзе: дзіцяці-калеку. У гэтай жа праграме іншы карэспандэнт гаворыць: "Два дзіцяці начавалі на вакзале". Правільна будзе: два дзіцёнкі або двое дзяцей. Цяжка з гэтымі дзецьмі...

**Сяржук Вітушка**

# СІНДРОМ ГАМСУНА

Стрэмкі

## БЯДА НАРОДА, У ЯКОГА І ПАЭТЫ – ПРАДАЖНЫЯ

Крыўдна, калі паэта забіваюць на дуэлі.

Балюча, калі ён недарэчна гіне ў самым росквіце – ад хваробы, у катастрофе ці ад гарэлкі.

Ды не лягчэй, калі ён сам – сваімі ўчынкамі – губіць створанае. Застаючыся жывым як "фізічная асоба".

Паэзія – як грашовыя знакі. Траціцца залатое забеспячэнне – і яны становяцца проста задрукаванай паперай. Так і з вершамі: калі аўтару не хочацца падаваць руку, не цягне й чытаць напісанае рукой ягонай.

Тэксты, скажаце, каштоўныя самі па сабе, праз сваю ўласную вартасць. Так, ды не зусім.

Вось, скажам, кнігі нарвежца Кнута Гамсуна назаўсёды застануцца ў літаратуры. Хоць аўтар пад канец жыцця запляміў сябе калабарацыяй з гітлераўцамі. І быў за гэта выкляты сваімі чытачамі, якія кідалі яму праз плот ягоныя кнігі.

(Так у нас мастак і паэт Рыгор Сітніца вярнуў Таісе Бондар падпісаную яму аўтаркай кнігу, калі яна заняла "вернападданскую" пазіцыю.)

Гамсун, прынамсі, зганьбаваў сябе ў старэчым узросце. Маразм – не каньяк, з гадамі толькі горшае.

А колькі было такіх, што свядома, з маладых гадоў ставілі свае таленты на службу рэжыму? Ад Маякоўскага да Аляксея Талстога і Валянціна Катаева.

Паэт Барыс Чычыбабін, які ўсё жыццё адпрацаваў сціплым бухгалтарам у трамвайным дэпо, каб не гвалціць свой талент, напісаў верш пра здраду, дзе "Катаев" рыфмаваўся з "негодяев".

А Веніямін Каверын назваў Катаева "полюсом безнравственности".

Тым не менш, усе тры вышэйпамянёныя будуць чытацца заўсёды, а паэт Чычыбабін, пры ўсёй павазе да яго як чалавека, так і застаўся малавядомым...

Праблема "генія і зладзейства" – вечная.

Але ў Беларусі яна мае сваю спецыфіку.

Мы злоўжываем паняццямі – "фашызм", "дыктатура", маўляў, вярнуліся ў 1937 год...

Як бы сумна ўсьміхнуліся Янка Купала, Кузьма Чорны ці Ўладзімір Дубоўка, слухаючы гэтыя ляманты.

Любая літаратура – даступная. Для тых, хто хоча. Радыёгаласы – не глушаць. Выехаць куды хочаш – і вярнуцца, – складана, але магчыма. (Апроч ЗША – і тое не таму, што не выпускаюць, а – не ўпускаюць.)

Калі Купала і Колас, сціснуўшы зубы, пісалі хваласпевы Сталіну, ім пагражала рэальная, — і пакутніцкая, смерць. Або ГУЛАГ. І не толькі ім, а і іхнім родным.

Нашым "рыцарам пяра" пагражаў не расстрэл у Курапатах, нават не "хімія" ці 15-сутачны "адпачынак" у "гатэлі" на Акрэсціна, — а толькі страта пасадаў у рэдакцыях і выдавецтвах.

Адна з галоўных рысаў цяперашняга рэжыму – усё ж не жорсткасць (хоць хто ж яе аспрэчвае), а – тое, што акрэсліваецца неперакладным словам "пошлость". (Здаецца, Набокаў – расійскі празаік, які ствараў на эміграцыі па-ангельску – так і пісаў: poshlost.)

Служыць такому рэжыму і захаваць свой талент – немагчыма.

*Сяброўкі абсталёўваюць кватэры,*
*я п'ю ў лясах на досвітку расу*
*і незалежна, з выглядам гетэры,*
*чыёсьці сэрца ў кошыку нясу.*

Такія вершы маглі б чытаць рамантычныя дзяўчаты пры святле ліхтарыка ледзяной ноччу ў стылым намёце на плошчы Каліноўскага.

Ды – не чыталі. Напэўна.

Бо напісала іх у часы сваёй маладосці цётка, якая цяпер заадно з касталомамі, што неўзабаве будуць біць гэтых дзяўчат дубінкамі.

Усіх астатніх, хто няшчыльнымі радамі, – хто навыперадкі, хто з-пад палкі, — падаўся да карыта "новага" СП, я разумею. Яны толькі гэтага карыта й вартыя.

Але – Раіса Баравікова, паэзія якой піла не з цэбра, а – з нябеснага келіха?..

На якога чытача яна цяпер разлічвае?

Хто адгукнецца на яе словы –

*Прыйдзі, прыйдзі...*
*Я вольная ад спраў.*
*Спявае ноч, і больш такой не будзе.*
*Сляды твае прыкрыюць пікі траў...*

Адміністрацыя прэзідэнта? Холдынг? Омон?

*"О як бы кармілі грудзі такія"* – уздыхаў Максім Танк у сваім "Ave Maria".

О, як жа патрэбна была б такая светлая лірыка цяпер, калі ўсё менш паэзіі і ўсё больш вершападобных тэкстаў.

Што ж, той жа Максім Танк адным з першых пайшоў верай і праўдай служыць тым, хто душыў аснову асноў ягонай паэзіі – беларускую мову.

Бяда народа, у якога й паэты – прадажныя.

Нічога новага пад сонцам. Так і творыцца гісторыя, – не на старонках кніг, не ў тэлевізары і не на сцэне, – у жыцці. І дзейныя асобы – мы самі.

Проста цяпер трыццаць срэбнікаў выплочваюць праз банкамат.

**Алег Аблажэй**

# Невядомая Беларусь

**18 лістапада** 1926 году адбылося так званае ўзбуйненне БССР. Рэч у тым, што пасля адыходу Заходняй Беларусі да Польшчы, а ўсходніх тэрыторыяў да Расіі, Савецкая Беларусь выглядала на карце зусім ужо жалю вартай палоскай. І вось у такі самы дзень палітбюро ЦК усесаюзнай кампартыі, разгледзеўшы высновы камісіі, якая перад тым працавала ў Гомельскай губерні, пастанавіла „лічыць даказаным беларускі характар насельніцтва Гомельскага і Рэчыцкага паветаў і прызнаць неабходным далучэнне адзначаных паветаў да БССР».

**19 лістапада** 1557 году пакінула гэты свет каралева Бона, адна з кіраўнічак сярэднявечнай Беларусі. Сама яна была італьянка і шмат зрабіла для развіцця беларускіх земляў і для збліжэння Беларусі з Заходняй Еўропай. З ініцыятывы каралевы Боны была праведзена вялікая аграрная рэформа. У Беларусь прыехала багата суродзічаў каралевы -- італьянцаў: мастакоў, навукоўцаў, дойлідаў, вайскоўцаў ды купцоў. Беларусь была натуральным чынам прыцягнутая ў сферу ўплыву італьянскага рэнесансу. А памерла Бона Сфорца ў сябе на радзіме ў Італіі.

**20 лістапада** 1930 году народны паэт Беларусі Янка Купала робіць замах на ўласнае жыццё. Пасля разгромных артыкулаў у друку і допытаў у ГПУ паэт не бачыў для сябе іншага выйсця, чым самагубства. Спроба паэта зрабіць сабе харакіры ў 1930-м годзе, не ўдалася — перашкодзіла пільнае атачэнне.

**21 лістапада** 1926 году ў Мінску завяршае сваю працу акадэмічная канферэнцыя, што збіралася для рэформы беларускага правапісу. Гэта быў сапраўдны пік савецкай беларусізацыі, і канферэнцыя прыцягнула да сябе міжнародную ўвагу. На яе прыехалі прафесар Біржышка з Коўна, паэт Яніс Райніс з Латвіі, прафесар Макс Фасмер з Берліна ды мноства іншых знакамітасцяў.




**Рэклама на краме** *рытуальных паслуг. Свіслач, лістапад 2006 году.*

**МАТЭРЫЯЛЫ НЕЗАЛЕЖНАЙ ГАЗЕТЫ «СВАБОДА» ВЫ МОЖАЦЕ ЧЫТАЦЬ ТАКСАМА Ў ІНТЭРНЭЦЕ НА САЙЦЕ**

**VILNIA.COM**

**Заснавальнік** ТАА "Тут і цяпер"
**Галоўны рэдактор** А. Уласаў (email: gazeta@tyt.by)
**Адрас** 220013 г. Менск, пл. Каліноўскага, 1-а
**Тыраж** 299 экзэмпляраў